кольнул ему копьем в сердце. Пошёл ливень, и все ушли, а Левий Матвей, перерезав верёвки, забрал тело Иешуа.

Оба сна, сон Никанора Ивановича и сон Ивана Николаевича, объединены пространством – психологической клиникой Стравинского.

Для булгаковского сна характерно смешение настоящего и мистического. Во снах может строиться целый мир как с уже существующими в реальности персонажами, так и с вымышленными, рожденными самим сновидением (Канавкин Николай, красотка Ида Геркуланова). В произведении сон выполняет метафорическую функцию.

Использование Булгаковым приёма сна расширяет художественные возможности автора, способствует раскрытию и передаче его уникального авторского взгляда, а также позволяет читателю погружаться в состояние персонажей, лучше начинает понимать действия героев.

**Список литературы**

1 Акатова, О. И. Поэтика сновидений в творчестве М. А. Булгакова: автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.01.01 / О. И. Акатова. – Саратов, 2006. – 228 с.

2 Булгаков, М. А. Мастер и Маргарита / М. А. Булгаков. – СПб.: Азбука-Аттикус, 2022. – 480 с.

*УДК 821.161.3-14**

**Т. А. Лозка**

***Навук. кір. – А. М. Мельнікава, д-р філал. навук, прафесар***

## ВОБРАЗ ЛІРЫЧНАГА ГЕРОЯ Ў ТВОРЧАСЦІ А. РАЗАНАВА

*У артыкуле разглядаецца вобраз лірычнага героя ў творчасці А. Разанава. Паказваецца, што лірычны герой А. Разанава перш за ўсё мысліцель і шукальнік, які спасцігае самога сябе ў суадносінах з акаляючым светам. Сцвярджаецца, што шлях пошуку і спасціжэння ўнутранай сутнасці чалавека падобны да працэсу творчасці, які дазваляе судакрануцца з нязведаным. Праз спасціжэнне свайго “я” адбываецца спасціжэнне сусвету.*

Лірычны герой – умоўны тэрмін, якім абазначаюць вобраз, што ўзнікае ў свядомасці чытача ў выніку знаёмства з лірычнай творчас-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цю таго ці іншага паэта [1, с. 47]. Зразумець лірычнага героя А. Разанава немагчыма, не ўсвядоміўшы гранічную прысутнасць у вобразе лірычнага “я” самога паэта. У дадзеным выпадку не будзе памылкай атаясамліванне лірычнага героя з асобай аўтара. Больш таго, такія паняцці, як лірычны герой, паэт, чалавек увогуле ў паэзіі А. Разанава часам выступаюць як узаемазамяняльныя, што абумоўліваецца філасофскай скіраванасцю лірыкі творцы. Напоўненая разважаннямі, паэзія А. Разанава ставіць агульначалавечыя пытанні, якія адрасуюцца кожнаму:

*Ці ведае чалавек урэшце, што яму лепш, а што горш,*
*што – страта, а што – набытак,*
*што – немач, а што – здароўе,*
*што – мала, што – шмат?* [2, с. 25].

Лірычны герой А. Разанава – перш за ўсё шукальнік. У творчасці паэта сцвярджаецца, што чалавек на працягу жыцця спасцігае самога сябе ў суадносінах з акаляючым светам:

*Мы адцярушваем ад глухаты свой слых, адтуляем ад слепаты свой зрок, з няўцямнасці выплаўляем сваё разуменне* [2, с. 19].

Мэта такога спасціжэння – зразумець, хто такі чалавек і чым вызначаецца ягоная сутнасць, дзеля чаго ён створаны і на што здольны:

*Я ў крузе, дзе слова шукае Слова, а чалавек – Чалавека* [2, с. 10].

Аднак адказ на пытанне “Хто ты такі?”, з якім звяртаецца да чалавека сфінкс у версэце “Узбочча”, знайсці не проста. Чалавек даў азначэнні з’явам і прадметам акаляючага свету, але дагэтуль не здолеў зразумець, кім з’яўляецца сам:

*Адказваюць за чалавека гадзіннікі, вагі, календары, слупы,*
*адказваюць маленькія сонцы, месяцы, зоркі – узнагароды,*
*адказваюць могілкі – край узбочча,*
*а сам чалавек маўчыць* [2, с. 68].

Лірычны герой А. Разанава не пакідае спроб знайсці адказ на пытанне сфінкса, таму што неабходнасць гэтага пошуку, самаідэнтыфікацыі закладзена ў ягонай сутнасці і нішто вонкавае не можа пагасіць гэта ўнутранае імкненне:

*Згадзіўся,*
*змоўк,*
*прывык –*
*абуты і адзеты…*
*А патаемны крык*
*цябе шукае:*
*дзе ты?!* [2, с. 134].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пры гэтым шлях пошуку і спасціжэння сваёй сутнасці для А. Разанава шмат у чым падобны да працэсу творчасці, таму што і першы, і другі адбываюцца не на паверхні, а патрабуюць паглыблення ў іншыя сферы:

*Калі паэт ведае, што ён хоча сказаць, ён не здолее гэтага сказаць (прынамсі, як паэт), для гэтага ён мусіць вярнуцца ў тую глыбіню, дзе нязведанае яшчэ не стала зведаным, інтуітыўнае – рацыянальным і дзе рэчы яшчэ не маюць імёнаў* [3, с. 248].

У глыбіні, пра якую гаворыць А. Разанаў, заключаецца сапраўднае веданне, яно інтуітыўнае, звязанае з быццём чалавека на духоўным узроўні. Да гэтай глыбіні мусіць звяртацца чалавек, які намагаецца вызначыць самога сябе, і з гэтай глыбінёй павінен узаемадзейнічаць паэт, каб данесці да іншых свае веды.

У творчасці А. Разанава цесна паяднаны ў адзін ланцужок такія складнікі, як вонкавае жыццё, прысутнасць у ім індывіда, унутраны свет гэтага індывіда, творчасць як здольнасць праяўлення ўнутранага свету індывіда:

*Чым большую глыбіню адкрывае ў сабе чалавек, тым больш у ёй не агульнага, а свайго, якое становіцца сваім і для іншых.*

*Гэта ўласцівасць – і ў гэтым асаблівасць – творчасці* [3, с. 264].

Творчасць – гэта імкненне захаваць сваё, пакінуўшы яго ў іншых, бо думка становіцца мёртвай, калі яна губляецца ў адным чалавеку, і думка жывіцца, знаходзіць свой працяг, калі яна ўспрынятая іншымі.

Лірычны герой А. Разанава апантаны імкненнем спазнаць таямніцы жыцця, якія маюць пэўную суаднесенасць з таямніцамі творчасці. Творчасць жа, як сцвярджае А. Разанаў, скіроўвае чалавека на судакрананне са сваёй самасцю, з тымі якаснымі адзнакамі свайго ўнутранага "я", якое было згублена:

*Стан творчасці, у якім удзельнічаюць глыбокія пласты чалавечай існасці, адкрывае чалавеку тое, што ён забыў альбо страціў, – я г о веды, я г о рэчаіснасць, якая тым больш сапраўдная, чым больш я г о* [3, с. 264].

Як лічыць Г. Кісліцына, "у крайне аб'ектыўным суджэнні А. Разанаў выказвае думку, што творчасць пэўным чынам абумоўлівае чалавечую рэчаіснасць, калі не для ўсіх, то хаця б для самаго творцы" [4, с. 99]. Успрыманне рэчаіснасці знаходзіцца пад уплывам акту тварэння. Паэт, такім чынам, сцвярджае пастулат аб матэрыяльнасці думкі, ён верыць у сілу думкі, у стваральную сілу слова.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Сапраўднасць рэчаіснасці – паэтычнай прасторы, у якой існуе лірычны герой А. Разанава – вызначаецца тым, наколькі асоба здольная да ўнутранай рэфлексіі, наколькі жадае і імкнецца разважліва ставіцца да жыцця і ўсведамляць сябе ў гэтым жыцці:

*Як бы ні імкнулася дрэва*
*ў неба,*
*яно ўсё роўна*
*не дасягае неба…*
*Але, магчыма,*
*ніякага іншага неба няма,*
*апроч самога імкнення* [2, с. 156].

Менавіта таму на шляхах гэтай рэчаіснасці лірычны герой А. Разанава – мысліцель, які пераўтварае жыццё ў вандроўку ў пошуках ісціны:

*…чалавеку нічога не застаецца,*
*як, зрэшты, выбраць*
*тую дарогу, якая яго спакон веку чакае, –*
*дарогу ўгору* [2, с. 150].

Ён імкнецца да непазнанага – да тае недасяжнасці, дзе зліваюцца зямля і неба, і недасяжнасць небакраю не ў яго адлегласці, а ў яго няўлоўнасці. “Усё жыццё вандроўніка – пошук ісціны, які настойліва асацыіруецца з палётам стралы сэнсу, якая ляціць наперарэз небакраю, як смерць”, – адзначае У. Калеснік у дачыненні да творчасці А. Разанава [5, с. 218]. Паэт неаднаразова звяртаецца да вобразаў стралы і палёту, якія выступаюць сімваламі пазнання сусвету:

*І ляціць нацянькі страла, вынікаючы безупынна з сябе самое, вызваляючыся ад сябе самое, каб, зрэшты, зрабіцца палётам самім* [2, с. 61].

Пошук і імкненне да авалодання ісцінай набліжаюць лірычнага героя да пазнання самога сябе, а значыць і рэчаіснасці, і гэта безупынны працэс:

*Местазнаходжанне сэнсу – адсутнасць гэтага месца: яно ў пастаянным змяшчэнні, у сустрэчы з невядомасцю* [3, с. 224].

Імкненне лірычнага героя да спазнання сэнсу ў А. Разанава – гэта рух, які прадстаўляецца ўнутраным працэсам, – гэта рух чалавечай думкі:

*Думка ідзе ўслед за жыццём, жыццё – услед за думкай, але гэта не рух па крузе, гэта рух усім кругам – у новую якасць, у новае вымярэнне* [3, с. 182].

Такім чынам, лірычны герой у творчасці А. Разанава імкнецца вытлумачыць для сябе свет, акрэсліць межы рэчаіснасці і вызначыць



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

яе сапраўднасць. Спасціжэнне свету адбываецца ў тым ліку праз пазнанне свайго ўнутранага "я", праз паглыбленне ва ўнутраную сутнасць чалавека. Пазнанне таямніц жыцця пэўным чынам суадносіцца з працэсам творчасці. Менавіта стан творчасці дазваляе чалавеку судакрануцца з глыбіннымі пластамі падсвядомасці, наблізіцца да сябе першароднага і чыстага, здольнага ствараць сваімі памкненнямі, зрухамі думкі і сілаю слова ўласную рэчаіснасць.

## Спіс літаратуры

1 Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. – 3-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – 576 с.

2 Разанаў, А. Вастрыё стралы : Версэты, лірычныя мініяцюры / А. Разанаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1988. – 158 с.

3 Разанаў, А. Паляванне ў райскай даліне : Версэты. Паэмы. Пункціры. Вершаказы. З Вяліміра Хлебнікава. Зномы / А. Разанаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1995. – 287 с.

4 Кісліцына, Г. Алесь Разанаў : Праблема мастацкай свядомасці / Г. Кісліцына. – Мінск : Беларуская навука, 1997. – 143 с.

5 Калеснік, У. Страла і мэта / У. Калеснік // Усё чалавечае : Літаратурныя партрэты, артыкулы, нарысы. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1993. – С. 209-233.

*УДК 821.161.1-1*А.А.Ахматова:27*

**А. А. Микула**

***Науч. рук. – Е. А. Кастрица, канд. филол. наук, доцент***

## ХРИСТИАНСКИЕ ОБРАЗЫ И МОТИВЫ В ПОЭЗИИ АННЫ АХМАТОВОЙ

*Автор статьи обращается к христианским образам и мотивам, представленным в поэзии Анны Ахматовой, определяет причины появления, рассуждает об особенностях их интерпретации, обращает внимание на их наполненность психологическим состоянием и переживаниями лирических героинь.*

Словесность и религия неразрывно взаимосвязаны. Религиозные смыслы существуют в сознании людей и воплощаются, прежде всего, в словах (в традиции христиан слову отводится особенное

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ